Водзыў

на аўтарэферат дысертацыі **Кітурка Ірыны Фёдараўны**

"Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)",

прадстаўленай на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці "07.00.02 – айчынная гісторыя"

Дысертацыйнае даследаванне І.Ф. Кітурка прысвечана распрацоўцы і вырашэнню праблемы стварэння дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст., якая да гэтага часу не была вывучана ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарыяграфіі. Разам з тым, на сучасным этапе, калі ўзрастае роля мытнай службы Рэспублікі Беларусь у абароне нацыянальнага рынку, што, бясспрэчна, садзейнічае развіццю эканомікі і забяспячэнню эканамічнай бяспекі краіны, у грамадстве ўзнікае запатрабаванасць у разуменні працэсу стварэння і развіцця мытнай службы. У сувязі з гэтым прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца своечасовай і патрэбнай.

Дысертацыяй І.Ф. Кітурка заснаваны новы кірунак у беларускай гістарыяграфіі – вывучэнне станаўлення і дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у кантэксце дзяржаўных эканамічных інтарэсаў і сацыяльна-палітычных падзей другой паловы XVIII ст.

У аўтарэфераце пераканаўча абгрунтавана актуальнасць абранай тэмы, выразна акрэслены аб'ект і прадмет даследавання. Прадуманыя мэта і задачы дазволілі аўтару граматна структурыраваць навуковую працу і ў шасці главах асвятліць пытанні, звязаныя са станаўленнем і развіццём дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. у шырокім і вузкім сэнсах.

На падставе вывучэння значнай колькасці крыніц, большасць якіх упершыню ўведзена ў навуковае абарачэнне, і глыбокага крытычнага аналізу айчыннай і замежнай (расійскай, польскай, літоўскай, украінскай) гістарыяграфіі аўтарам дысертацыі пераканаўча даказана, што створаная ў другой палове XVIII ст. мытная служба ВКЛ стала адным з першых спецыяльных дзяржаўных інстытутаў у сістэме дзяржаўнага кіравання ВКЛ.

У якасці заслуг саіскальніка неабходна адзначыць, што ў дысертацыі ўпершыню ў гістарыяграфіі дадзена разгорнутая характарыстыка прычын станаўлення, дынамікі развіцця і скасавання мытнай службы з ацэнкай яе ўнёску ў сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ. І.Ф. Кітурка паказала ролю і значэнне Скарбавай камісіі ВКЛ у працэсе станаўлення і развіцця дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст., арганізацыі сістэмы кантролю за эфектыўнасцю працы дзяржаўных мытных служачых.

Аўтарам не толькі ахарактарызавана арганізацыйная структура дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ (рэпартыцыі – каморы – прыкаморкі – обер-стражы – стражы – экспакгаўзы), але і паказана дынаміка зменаў колькасці і месцазнаходжання мытных пастоў у даследуемы перыяд, высветлены прычыны такіх змен.

Безумоўнай навіной у гістарычнай навуцы з'яўляецца вызначэнне дысертантам парадку камплектавання штата дзяржаўных мытных служачых

ВКЛ у другой палове XVIII ст.; раскрыццё механізму фінансавання дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ; высвятленне ўнеску мытнай службы ў фарміраванне дзяржаўнага скарбу і скарбу вялікага князя і вызначэнне фактараў, якія ўплывалі на памеры сум грашовых паступленняў; аналіз люстрацый як перыядычных дзяржаўных мерапрыемстваў па праверцы эфектыўнасці дзейнасці мытняў і ўдасканаленні іх працы; прадстаўленне разгорнутай характарыстыкі правіл дакументавання мытных працэдур і афармлення справаздачных дакументаў.

Навуковая навізна і значнасць атрыманых І.Ф. Кітурка вынікаў не падлягаюць сумненню і ўносяць істотны ўклад у развіццё айчыннай гістарычнай навукі. Зробленыя аўтарам дысертацыі высновы прайшлі навуковую апрабацыю на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і знайшлі сваё адлюстраванне ў навуковых выданнях, у тым ліку за мяжой.

Такім чынам, аўтарэферат І.Ф. Кітурка адпавядае патрабаванням да прац падобнага роду, дае добрае ўяўленне аб дысертацыі, афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі.

Лічу, што дысертацыя І.Ф. Кітурка “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)”, якая з’яўляецца самастойным завершаным нвуковым дследавннем і ўтрымлівае грунтоўныя і важныя для сучаснай гістарычнай навукі высновы, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі
і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ,
доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Гужалоўскі

1 лістапада 2023 г.

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
гістарычны факультэт